https://nashaniva.com/348588

«Не разумею, навошта гэта раблю». Беларусу ў Кітаі прыйшлося надзімаць заколатую свінню ручной помпай

Бацька беларускі Настассі, якая ўжо пяць гадоў жыве ў Кітаі, падчас візіту да дачкі далучыўся да традыцыйнага для кітайскай вёскі працэсу — калектыўнага забою і раздзелкі свінні.

Беларуска Настасся (вядомая ў Кітаі пад імем Намэй) у 2020 годзе выйшла замуж за жыхара кітайскай правінцыі Хунань і засталася там жыць. Іх пара ў свой час стала [папулярнай](https://www.am730.com.hk/%E4%B8%AD%E5%9C%8B/512104/1.58%E7%B1%B3%E6%B9%96%E5%8D%97%E6%BC%A2%E7%9B%B8%E7%9D%875%E5%B9%B4%E9%A3%9F%E7%99%BD%E6%9E%9C-%E6%84%8F%E5%A4%96%E5%A8%B61.76%E7%B1%B3%E7%99%BD%E4%BF%84%E7%BE%8E%E5%A5%B3%E7%B5%84%E6%9C%80%E8%90%8C%E8%BA%AB%E9%AB%98%E5%A4%AB%E5%A6%BB%E6%AA%94-%E6%9C%89%E7%89%87-) у кітайскіх сацыяльных сетках дзякуючы здымкам з вяселля, на якіх заўважна істотная розніца ў росце. Рост Настассі — 176 см, у той час як яе мужа — 158 см.

На канале ў ютубе інтэрнацыянальная сям'я нядаўна апублікавала відэа з візіту ў Кітай бацькі Настассі, які вырашыў дапамагчы мясцовым сваякам з [забоем свінні](https://nashaniva.com/100177).

Сям'я прыехала на ферму, дзе вырошчваюць чорных свіней. Яны папулярныя ў гэтай частцы Кітая — свіней трымаюць амаль два гады, пакуль яны не дасягнуць масы 200—250 кг (у Беларусі ж пераважаюць белыя пароды свіней, якіх гадуюць каля года да вагі 160 кг). Пры гэтым склад корму — бульба і мука — аказаўся практычна такім жа, як у Беларусі.

Асаблівай цяжкасцю стала пагрузка выбранай жывёлы. На відэа бачна, як некалькі мужчын, уключаючы бацьку Настассі, спрабуюць зацягнуць масіўную свінню ў клетку на прычэпе. Пасля напружанай барацьбы свінню ўсё ж удалося загрузіць і даставіць да месца забою.

Як закалолі, пачаўся этап, які выклікаў у беларускага госця найбольшае здзіўленне, — напампоўванне тушы паветрам пры дапамозе помпы, якой колы качаюць.

«А навошта? Для чаго? Не разумею», — пытаецца мужчына.

Яму жартам тлумачаць, што гэта для таго, каб жывёла падавалася большай. Насамрэч паветра нацягвае скуру, што дапамагае лягчэй і хутчэй выдаліць грубое чорнае шчацінне.

На гэтым адрозненні ў тэхналогіі не заканчваюцца. Замест звыклага беларусу смалення агнём кітайцы выкарыстоўвалі гарачую ваду і скрабкі. Бацька Настассі актыўна дапамагаў чысціць скуру, адзначаючы, што дома для гэтага выкарыстоўвалі б касу.

Наступным крокам стала падрыхтоўка да раздзелкі. Тушу прывязалі за заднія ногі да звычайных драўляных драбін, а затым разам з імі паставілі старчма, прыхінуўшы да сцяны.

У працэсе разбору актыўны ўдзел браў і бацька Настассі. Паводле слоў мужчыны, гэтая праца яму

добра знаёмая: за сваё жыццё ён закалоў і разабраў два дзясяткі кабаноў.

«Галоўнае — не прарэзаць кішак, каб не было паху», — каментаваў ён працэс.

У фінале беларус, выціраючы рукі, прынюхаўся да свежаніны:

«Яна нічым не пахне. Гэта сведчыць пра тое, што мяса і сала вельмі смачныя, [бо жывёла] адкормленая натуральным прадуктам».

Каментарыб